10. Фокин, В. И. «Политика умиротворения» как последствие кризиса Версальской системы / В. И. Фокин // Первая мировая война, Версальская система и современность : сб. ст. / Новикова И. Н., Павлов А. Ю., Малыгина А. А. (отв. ред.). – СПб. : СПбГУ, 2014. – С. 349–360.

11. Михайлова, Е. Е. Ключевые приоритеты внешнеполитической стратегии Великобритании в 1939–1941 гг. / Е. Е. Михайлова // Вестник Нижегородского университета им. Н. И. Лобачевского. – 2013. – № 2 (1). – С. 189–196.

УДК 943.8.081

**Р. Р. Лазько**

*ГДУ імя Ф. Скарыны, г. Гомель*

# РЭАЛІЗАЦЫЯ САВЕЦКІМ КІРАЎНІЦТВАМ ЛЕНІНСКАЙ ЗНЕШНЕПАЛІТЫЧНАЙ ДАКТРЫНЫ НА ПАЧАТКУ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

*У артыкуле адхіляецца фаталістычны падыход да міжнароднага палітычнага крызісу вясны – лета 1939 г., на аснове якога часткай гісторыкаў фармулюецца ацэнка аб непазбежнасці вайны ледзь не ад самага пачатку крызісу і аб сітуітыўным характары дзеянняў СССР у яе пачатку. Паводзіны СССР ва ўмовах гэтага крызісу магчыма адэкватна ацаніць толькі з улікам яго знешнепалітычнай дактрыны, асновы якой былі распрацаваны Леніным у 1918–1920 гг. і заставаліся актуальнымі ў 1939 г.*

Сярод матываў, схіліўшых бальшавікоў да гвалтоўнага захопу ўлады ў Расіі, былі спадзяванні на тое, што гэтай акцыяй удасца падштурхнуць сусветную рэвалюцыю, без якой яны не ўяўлялі сваёй канчатковай перамогі. Аднак ішоў дзень за днём, а рэвалюцыя ў Еўропе не пачыналася. Давялося асвойваць азбуку рэальнай палітыкі, пачаўшы гэтую “вучобу” з сепаратных перагавораў аб міры з Германіяй, якія завяршыліся заключэннем “ганебнага” Брэсцкага міру – ганебнага ўдвайне: для Расіі як для дзяржавы і для бальшавікоў як для рэвалюцыйнай партыі. Нягледзячы на тое, што мірны дагавор на цяжкіх для Расіі ўмовах выклікаў глыбокі крызіс у краіне і ў партыі, ён высока ацэньваўся яго ініцыятарам, бальшавіцкім лідарам Уладзімірам Леніным, паколькі забяспечыў “перадышку”, неабходную для ўмацавання ўлады і перанясення рэвалюцыі за межы Расіі. Пасля таго, як менш чым праз год Германія



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

пацярпела паражэнне ў вайне, а дагавор быўануляваны, ленінская ацэнка палітыкі "перадышкі" набыла агульнапартыйнае прызнанне як асноўная догма савецкай знешняй палітыкі, яе прынцып у адносінах з заходнім капіталістычным светам. Яна разглядалася як палітыка лавіравання, выкарыстання супярэчнасцей у лагеры праціўнікаў для яго аслаблення. Абапіраючыся на гэтую догму, Савецкая Расія на працягу 1920 г. заключыла серыю дагавораў аб міры са сваімі ўсходнееўрапейскімі суседзямі, паспрыяўшых зніжэнню іх недаверу да бальшавікоў і пэўнаму іх дыстанцыраванню адзаходніх пратэктараў. Але за гэта давялося заплаціць прызнаннем іх суверэнітэта і абвешчаных імі дзяржаўных граніц. Завяршылася фарміраванне савецкай знешнепалітычнай дагматыкі пасля няўдалай спробы бальшавікоў разваліць толькі што створаную Версальскую сістэму міжнародных адносін. Такой спробай быў паход Чырвонай арміі на Варшаву падчас вайны з Польшчай у 1920 г. Выяснілася, што сістэма акзалася мацнейшай, чым можна было меркаваць, і што для яе разбурэння (у неабходнасці гэтага сумненняў не існавала) давядзецца чакаць іншага моманту і ўсімі даступнымі сродкамі набліжаць яго.

Ідэйныя асновы савецкай знешняй палітыкі, разлічанай на існаванне савецкай дзяржавы ў капіталістычным акружэнні, прадставіў У. Ленін у дакладзе на IX партыйнай канферэнцыі ў верасні 1920 г., прысвечаным аналізу прычын і вынікаў няўдачы першай спробы разбурыць версальскі лад. Нягледзячы на гэтую няўдачу, "асноўная палітыка наша засталася тая ж, – гаварыў Ленін, – мы выкарыстоўваем кожную магчымасць, каб перайсці ад абароны да наступлення. Мы ўжо надарвалі Версальскі дагавор і дарвем яго, як толькі надарыцца зручны момант" [1, с. 389]. Ленін настойліва тлумачыў сваім таварышам па партыі неабходнасць рыхтаваць гэты момант. Калі нельга перамагчы двух сваіх ворагаў, гаварыў ён, – "трэба ўмець паставіць свае сілы так, каб яны пабіліся паміж сабой… але, як толькі мы будзем моцнымі настолькі, каб перамагчыў весь капіталізм, мы не марудзячы схопім яго за каўнер" [2, с. 58–59, 61, 66]. У гэтай сувязі Ленін адкрыта гаварыў аб неабходнасці нацкоўваць капіталістычныя групоўкі адна на другую, нават падштурхоўваць іх да вайны паміж сабой, каб аслабіць на карысць сацыялізму.

Выпрацаваны пад кіраўніцтвам Леніна курс міжнароднай палітыкі савецкай улады, пры ўсіх яго тактычных паваротах, застаўся прынцыпова нязменным на працягу міжваеннага часу. Праз 15 год Сталін напамінаў аб ім членам Палітбюро як аб вядомай ісціне, калі сцвярджаў аб фарміраванні ў Еўропе дзвюх новых груповак дзяржаў замест існаваўшых да сусветнай вайны. Ён амаль цытаваў Леніна: "Чым мацнейшай будзе



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

бойка паміж імі, тым лепш для СССР. Мы можам прадаваць хлеб і тым і другім, каб яны маглі біцца… Нам выгадна, каб бойка ў іх была як мага даўжэйшай, але без хуткай перамогі адной над другой” [3]. Заўважым, што ў гэты час афіцыйная савецкая дыпламатыя адстойвала ідэю аб сістэме калектыўнай бяспекі ў Еўропе.

Сталін як выканаўца ленінскага запавету ўвёў адну ўласную і важную дэталь у ленінскую канцэпцыю савецкай знешняй палітыкі. Яна датычыла паводзін СССР у выпадку ваеннага канфлікту паміж капіталістычнымі дзяржавамі. Асаблівую вагу ёй надавала тая акалічнасць, што яна была ўнесена пры абмеркаванні ваеннай рэформы на пленуме ЦК РКП(б) у студзені 1925 г. Сталін тады заявіў, што СССР “выступіць”, калі пачнецца вайна паміж капіталістычнымі групоўкамі, але “выступіць апошнім”. “Мы выступім для таго, каб кінуць вырашальную гіру на шалі, гіру, якая б магла пераважыць” [4, с. 14].

У той міжнароднай сітуацыі, якая склалася ў выніку Першай сусветнай вайны, “паставіць свае сілы так, каб ворагі сацыялізму пабіліся паміж сабой”, можна было толькі адным спосабам – спрыяючы адраджэнню Германіі, капіталістычнага праціўніка Версальскай сістэмы, дапамагаючы ёй аднавіць сваю здольнасць біцца супраць версальскіх дзяржаў. Гэтай стратэгічнай мэтай бальшавікоў – раскалоць, аслабіць капіталістычную сістэму і садзейнічаць яе разбурэнню – была, у першую чаргу, прадыктавана рапальская палітыка. Толькі з сярэдзіны 1920-х гадоў, калі ў бальшавіцкай партыі склалася разуменне таго, што сусветная рэвалюцыя затрымліваецца на няпэўны час, вырасла значэнне іншага, ствваральнага фактара рапальскай палітыкі. Ён быў абумоўлены імкненнем Савецкай Расіі, не чакаючы сусветнай рэвалюцыі, выйсці з міжнароднай ізаляцыі і пачаць з дапамогай Германіі пераўтварэнне краіны ў магутную сацыялістычную крэпасць, здольную ў зручны момант рашаць тую ж задачу развалу Версальскай сістэмы.

Аднак пасля прыходу да ўлады ў Германіі нацысцкай партыі савецкаму кіраўніцтву не ўдалося ўтрымаць свайго партнёра на рапальскай платформе, нягледзячы на тое, што яно не аднойчы сігналізавала яму аб сваёй гатоўнасці працягваць рапальскі курс [5, с. 480].Гітлераўская Германія згортвала палітычнае супрацоўніцтва з СССР, аддаючы перавагу палітычнай гульні з дзяржавамі Захаду, і гэта адбывалася ў даволі небяспечны для СССР момант, калі на Далёкім Усходзе ўзнікла пагроза японскай агрэсіі. Страціўшы рапальскую апору сваёй еўрапейскай палітыкі, савецкі ўрад быў вымушаны перайсці да палітыкі калектыўнай бяспекі (1934–1938 гг.). У межах гэтага курса СССР забяспечваў свой еўрапейскі тыл перад пагрозай з Усходу.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Але і палітыка калектыўнай бяспекі не была чыста кансерватыўнай, абарончай, як гэта выглядае на першы погляд. Страчваючы рапальскую апору сваёй еўрапейскай палітыкі ва ўмовах, калі Версальская сістэма захісталася, СССР не меў іншых магчымасцей забяспечыць сваю актыўную ролю ў справе новага еўрапейскага ўладкавання, акрамя ўдзелу ў калектыўных санкцыях супраць патэнцыяльнага агрэсара. А гаворка ішла менавіта аб такой перспектыве. Што да задачы правакавання канфліктаў паміж праціўнікамі савецкай дзяржавы, то яна заставалася актуальнай, аб чым сведчыць і цытаваная вышэй дырэктыва Сталіна членам Палітбюро наконт продажу хлеба.

Аднак і новая тактыка (“палітыка калектыўнай бяспекі”), нягледзячы на яе асобныя поспехі, не прывяла да пераўтварэння СССР у адзін з вядучых фактараў еўрапейскай палітыкі, здольны фарміраваць яе ў той самай меры, як Англія, Францыя, Германія. Восенню 1938 г. заходнімі дзяржавамі было праігнаравана жаданне СССР прыняць удзел у міжнароднай канферэнцыі, прысвечанай вызначэнню лёсу Чэхаславакіі [6]. Якую пазіцыю СССР збіраўся адстойваць на гэтай канферэнцыі – невядома. Сумненні наконт яе ўзнікаюць у сувязі з нядаўна ўведзенай расійскімі гісторыкамі ў навуковы ўжытак інфармацыяй [7, с. 204] аб савецкім, а не чэхаславацкім аўтарстве вядомай агаворкі аб тым, што СССР акажа сваю дапамогу Чэхаславакіі *толькі следам за Францыяй.* Відавочна,кіраўнікі савецкай дзяржавыне пазіцыяніравалі яе ў ролі адзінокага абаронцы Чэхаславацкай Рэспублікі. Але ці не намерваліся яны, акрамя таго, у адпаведны час кінуць на вагі барацьбы еўрапейскіх дзяржаў тую самую вырашальную савецкую гіру? Праблема патрабуе асобнага вывучэння.

Пад уплывам Мюнхенскай канферэнцыі ў Маскве склалася перакананне ў тым, што заходнія дзяржавы, спадзеючыся залагодзіць Германію, вядуць курс на перабудову Версальска-Вашынгтонскай сістэмы міжнародных адносін, ігнаруючы пры гэтым СССР. Гэта перакананне тактычна аблегчыла Сталіну фармуляванне ацэнкі міжнароднай сітуацыі на пачатку вясны 1939 г. як сітуацыі новай імперыялістычнай вайны, у якойСССР пакідае за сабой свабоду дзеянняў.Такую ацэнку ён выказаў 10 сакавіка 1939 г. з высокай трыбуны XVIII з’езда партыі ў справаздачным дакладзе ЦК ВКП(б). Прыкметы гэтай вайны Сталін убачыў у шэрагу падзей, пачынаючы ад захопу Італіяй Абісініі і заканчваючы захопам Судзецкай вобласці Германіяй [8, т. 1, с. 259]. Хоць Сталін назваў агрэсарамі Італію, Японію і Германію, але не выключаў супрацоўніцтва з імі, як і з іншымі дзяржавамі. Гэта мы бачым у яго фармулёўцы “задач партыі ў вобласці знешняй палітыкі”. На першае



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

месца была пастаўлена наступная: “Проводить и впредь политику мира и укрепления деловых связей со всеми странами” [8, т. 1, с. 263] (падкрэслім – “со всеми”). Такім чынам, разгляд міжнароднай часткі даклада Сталіна на XVIII з’ездзе партыі дазваляе зрабіць высновы, важныя для разумення палітыкі СССР у передваенным палітычным крызісе1939 г. З даклада вынікае, што савецкае кіраўніцтва вяло палітыку, зыходзячы з таго, што вайна ўжо ідзе, але не збіралася безумоўна падпарадкоўваць свае дзеянні інтарэсам яе спынення ці абмежавання яе маштабаў. Інакш навошта было заяўляць на ўвесь свет аб гатоўнасці ўмацоўваць “дзелавыя сувязі” з усімі краінамі, не выключаючы і агрэсараў? Такая пазіцыя поўнасцю адпавядала той мадэлі савецкай знешняй палітыкі, асновы якой вызначыў Ленін у 1920 г., і якую дабудоўвалі яго пераемнікі на чале са Сталіным.

Канстатацыя гэтага факта дазваляе сцвярджаць, што вясной 1939 г. адбывалася драматычнае разыходжанне вектараў знешняй палітыкі СССР і яго партнёраў з дэмакратычнага Захаду. Устрывожаныя новымі агрэсіўнымі дзеяннямі фашысцкіх дзяржаў, Англія і Францыя паварочвалі да супрацоўніцтва з СССР. Аднак, устаўшы на гэты шлях, яны не пайшлі настолькі далёка, каб даць савецкаму ўраду карт-бланш для дзеянняў у Усходняй Еўропе. Такая сітуацыя ўзнікла ў ходзе летніх перагавораў 1939 г. у сувязі з пытаннем аб ускоснай агрэсіі [9, с. 130]. Пазіцыя заходніх партнёраў па перагаворах узмацніла ў савецкім кіраўніцтве тэндэнцыю да ўзаемадзеяння з Германіяй, дзякуючы якому СССР спадзяваўся атрымаць дывідэнты ад працэсу развалу Версальскай сістэмы, якіх не абяцалі заходнія дзяржавы.Але атрымаць іх было магчыма толькі ў сітуацыі, калі б ворагі сацыялізму “пабіліся паміж сабой”.

Вясной 1939 г. такая перспектыва рабілася ўсё болей рэальнай у сувязі з развіццём польска-германскага канфлікту. Назаўтра пасля ўручэння польскім паслом у Германіі адмоўнага адказу Польшчы на прапановы Берліна аб германскім “калідоры” праз польскі  “калідор” і аб уключэнні Данцыга ў склад Германіі (гэта адбылося 26 сакавіка) Гітлер аддаў распараджэнне аб распрацоўцы плана вайны супраць Польшчы – “плана Вайс”. Уступную дырэктыву да яго Гітлер даў 3 красавіка, а 11 красавіка прадугледжаная планам аперацыя была ўключана ў “Дырэктыву аб адзінай падрыхтоўцы ўзброеных сіл да вайны”. Адпаведна ўказанню “фюрэра” ўзброеныя сілы Германіі павінны былі завяршыць падрыхтоўку аперацыі супраць Польшчы не пазней 1 верасня 1939 г. Вайна, як мы ведаем, сапраўды пачалася 1 верасня 1939 г. Але ці была яна непазбежнай? На аснове прыведзеных фактаў частка беларускіх гісторыкаў сфарміравала фаталістычную пазіцыю па пытанні



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

аб магчымасці прадухілення вайны. Маўляў, іншае,мірнае развіццё падзей з гэтага моманту было выключана, заставалася толькі прыстасоўвацца да ваеннай перспектывы. Тым самым ігнаруецца альтэрнатыўнасць гістарычнага працэсу, якая вынікае з неабмежаванасці яго колькасных і якасных параметраў. Замест таго, каб падпарадкавацца такому фаталізму, як правіла, ідэалагічна абумоўленаму, гісторык абавязаны імкнуцца ўлічыць найвялікшае багацце фактаў, што адносяцца да падзей (у гэтым выпадку да перадваеннага палітычнага крызісу 1939 г.), улічыць усе варыянты развіцця і высніць прычыны ажыццяўлення аднаго з іх, гэтага, а не іншага. Калі мы гаворым аб пачатку вайны ў Усходняй Еўропе ў верасні 1939 г., якая імкліва перарасла ў Другую сусветную вайну, то павінны ўважліва прыглядзіцца дапаводзін СССР ва ўмовах развіцця міжнароднага палітычнага крызісу 1939 г. і асабліва – да яго пазіцыі адносна польска-германскага канфлікту, *не адрываючы гэты агляд ад савецкайзнешнепалітычнай дактрыны*. Гэта неабходнасць дыктуецца тым, што СССР з яго матэрыяльным, ваенным і палітычным патэнцыялам меў вялікія магчымасці для ўплыву на развіццё крызісу ў тым ці іншым яго накірунку, у рэшце рэшт і на тое, каб крызіс перарос, або, наадварот, не перарос у сусветнаю вайну.

У гэтай сувязі нам зноў давядзецца звярнуцца да сталінскай ацэнкі міжнароднай абстаноўкі як абстаноўкі імперыялістычнай вайны, каб паставіць яе побач з іншым дакументам XVIII з’езда ВКП(б), на якім гэта ацэнка прагучала. Гаворка ідзе аб зацверджаным з’ездам плане развіцця народнай гаспадаркі на трэцюю пяцігодку, які цалкам адпавядаў сталінскай ацэнцы міжнароднай сітуацыі. Відавочна, Сталін, выступаўшы з палітычным дакладам ад імя ЦК ВКП(б), і блізкая да яго група вышэйшых кіраўнікоў прыйшлі да высновы, што час, калі СССР атрымае магчымасць кінуць “вырашальную гіру на вагі”, набліжаецца, таму неабходна прывесці вытворчасць на вышыню гэтай задачы. У плане развіцця народнай гаспадаркі на трэцюю пяцігодку прадугледжвалася значнае павялічэнне асігнаванняў на развіццё ваеннай прамысловасці і паскарэнне тэмпаў яе росту. Калі ў 1939 г. асігнаванні на гэтыя мэты складалі крыху болей 25 % дзяржаўнага бюджэту, то на пачатку 1941 г. рэальна склалі ўжо звыш 43 % [10, с. 200]. Відавочна, што ў выніку выканання заданняў трэцяй пяцігодкі савецкая знешняя палітыка атрымала б больш надзейную матэрыяльную апору длярашэння наступальных задач. Рашэнню такіх задач было падпарадкавана і савецкае стратэгічнае планаванне. Адпаведна з планам стратэгічнага разгортвання Чырвонай Арміі, прынятым у 1938 г., яна павінна была рыхтавацца да барацьбы на тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходня Украіны супраць



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

саюзных сіл Германіі і Польшчы! Гэты план сведчыць аб тым, што савецкі генштаб, знаходзячыся пад уплывам светапогляду палітычнага кіраўніцтва, дапусціў грубую памылку ў вызначэнні верагодных праціўнікаў СССР. Акрамя таго, у ім (як і ў замяніўшым яго плане 1940 г.), разглядаліся толькі варыянты наступальных дзеянняў савецкіх узброеных сіл, што цалкам адпавядала палітычнай дактрыне (ўмяшацца ў барацьбу ў зручны момант, каб кінуць вырашальную гіру на вагі).

Дактрынальныя і эканамічныя абмежаванні савецкай знешняй палітыкі (толькі часткова закранутыя ў гэтым артыкуле) неабходна ўлічваць, калі мы разглядаем англа-франка-савецкія перагаворы аб мерах стрымлівання агрэсараў, якія вяліся на працягу вясны – лета 1939 г. паміж трыма дзяржавамі. Разам з тым, неабходна ўлічваць і тое, што заходнія дзяржавы, Англія і Францыя, мелі свае абмежаванні на шляху да пагаднення з СССР, якое б стала сродкам утаймавання агрэсараў. Гэта быў недавер з іх боку да СССР як да дзяржавы, палітычнае кіраўніцтва якой прытрымлівалася ідэі аб неабходнасці ліквідацыі капіталістычнага ладу ва ўсіх краінах свету. Шырокамаштабная еўрапейская вайна магла толькі спрыяць рэалізацыі гэтай ідэі, як гэта было ў Расіі ў 1917 г., і ледзь не здарылася ў некаторых іншых краінах. Н. Чэмберлен, напрыклад, вясной 1939 г. канфідэнцыяльна гаварыў аб сваім недаверы іменна да матываў савецкага супрацоўніцтва з заходнімі дзяржавамі [7, с. 273]. Але акрамя гэтай прынцыповай прычыны недаверу да СССР дэмакратычных дзяржаў Захаду, была яшчэ адна: рэпрэсіі супраць камандных кадраў у савецкіх узброеных сілах, моцна іх аслабіўшыя, і наогул рэпрэсіі супраць розных груп насельніцтва ў СССР, ствараўшыя сітуацыю адчужэння паміж уладай і народам. Па гэтай прычыне на Захадзе склалася перакананне аб няздольнасці Чырвонай Арміі да наступальных дзеянняў. У гэтай сітуацыі палітычнаму кіраўніцтву Англіі і Францыі нялёгка было рашыцца звязаць свае дзяржавы ваенна-палітычным саюзам з СССР. Была выбрана тактыка весці перагаворы аб такім саюзе, каб самой пагрозай магчымага яго заключэння стрымліваць агрэсара, а ў выпадку неэфектыўнасці гэтай пагрозы ўсё-такі фарсіраваць перагаворы і заключыць рэальны саюз. Англіі вострa не хапала часу, каб павысіць патэнцыял сваіх сухапутных узброеных сіл і перш за ўсё авіяцыі. Але капітуліраваць перад Германіяй яна не збіралася, бо ў Лондане яшчэ вясной 1939 г. зразумелі, што мэтай гітлераўскай Германіі з'яўляецца не набыццё той ці іншай тэрыторыі, а ўстанаўленне сваёй гегемоніі ў Еўропе. Гэтага Англія не магла дапусціць, што павінен быў засведчыць і заключаны ёю 25 жніўня саюз з Польшчай. З аднаго боку, ён служыў папярэджаннем Германіі, а з другого – стаў сродкам націску на Польшчу. Адпаведна саюзнаму



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дагавору, Англія гатовая была дапамагаць Польшчы ў абароне яе суверэнітэта і незалежнасці, але не тэрытарыяльнай цэласнасці. Аднак у гэтай другой сваёй якасці – як сродак прымусу Польшчы да канкрэтных тэрытарыяльных саступак на карысць Германіі – англа-польскі саюзны дагавор страціў сваё значэнне ўжо ў момант яго падпісання, бо Германія знайшла іншы, радыкальны сродак задавальнення сваіх мэтаў адносна Польшчы. Ім стаў савецка-германскі дагавор аб ненападзенні з яго сакрэтным пратаколам, у якім Еўропа была падзелена на сферы інтарэсаў дзвюх дзяржаў.

Савецка-германскі дагавор аб ненападзенні ад 23 жніўня стаў вынікам перагавораў, якія СССР вёў паралельна з англа-франка-савецкімі перагаворамі. Некаторы час яны вяліся па звычайных дыпламатычных каналах – праз германскага пасла ў Маскве фон Шуленбурга і часовага паверанага ў справах СССР у Германіі Г. Астахава. Германская дыпламатыя, якую прыспешвала ўжо прынятае Гітлерам рашэнне аб нападзенні на Польшчу, праяўляла ініцыятыву, націскала на савецкіх партнёраў. А Сталін пэўны час марудзіў, прыцэньваўся да варыянтаў, якія выяўляліся на абедзвюх перагаворных пляцоўках. Англія і Францыя не згаджаліся прадаставіць СССР свабоду рук для дзеянняў у Усходняй Еўропе пад выглядам рэагавання не толькі на прамую, але і на так званую "ўскосную агрэсію". Яе савецкі ўрад разумеў шырока – як "унутраны пераварот або паварот у палітыцы [ўсходнееўрапейскіх дзяржаў], каб дагадзіць агрэсару" [9, с. 130]. Гэтую формулу не прынялі і самі ўсходнееўрапейскія дзяржавы.

Зусім іншую пазіцыю заняла Германія. 3 жніўня І. Рыбентроп заявіў часоваму павернаму ў справах СССР у Германіі Г. Астахаву, што "супярэчнасцей паміж нашымі краінамі няма на ўсёй прасторы ад Чорнага мора да Балтыйскага. Па ўсіх гэтых пытаннях можна дамовіцца…" Перагаворы хутка набылі характар абмеркавання канкрэтных пытанняў. Не хаваючы таго, што яны ставяцца ў сувязі з намерам Германіі развязаць вайну супраць Польшчы, гітлераўскі ўрад заяўляў аб незацікаўленасці лёсам Прыбалтыкі (акрамя Літвы), былой "рускай Польшчы", Бесарабіі, Украіны. 11 жніўня, адпаведна з рашэннем Палітбюро ЦК ВКП(б), Молатаў паслаў Астахаву тэлеграму, у якой даручыў паведаміць аб жаданні савецкага ўрада весці перагаворы па ўсіх гэтых пытаннях, а месцам іх правядзення прапанаваў Маскву [8, т. 2, с. 180, 184]. (Заўважым, англа-франка-савецкія перагаворы ваенных місій пачаліся толькі на наступны дзень). 15 жніўня Шуленбург уручыў Молатаву памятную запіску германскага ўрада, з просьбай далажыць яе Сталіну, у якой намячаліся контуры будучай дамовы і выказвалася прапанова аб



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

прыездзе ў Маскву Рыбентропа для яе канчатковага ўзгаднення і падпісання.

Згода савецкага ўрада на падпісанне дагавора з Германіяй, які прадугледжваў гвалтоўныя тэрытарыяльныя змены ў Усходняй Еўропе, рабіла беспрадметнымі англа-франка-савецкія перагаворы, накіраваныя якраз на супрацьдзеянне спробам такіх змен ці нават на прадухіленне іх. 21 жніўня адбылося апошняе пасяджэнне ваенных місій. Асобныя беларускія гісторыкі і сёння следам за савецкай гістарыяграфіяй тлумачаць зрыў перагавораў нязгодай Польшчы на пропуск савецкіх войск праз яе тэрыторыю для барацьбы з агрэсарам. Гэта пытанне савецкая місія, як вядома, паставіла 14 жніўня, заспеўшы ім англійскую і французскую місіі знянацку. Да таго часу яно не падымалася на якім-небудзь узроўні ў ходзе англа-франка-савецкіх перагавораў, таму, натуральна, ні генерал Думенк, кіраўнік французскай місіі, ні адмірал Дракс з боку англічан, на гэта пытанне адказаць не маглі. Яно знаходзілася ў кампетэнцыі ўрада Польскай Рэспублікі, а Польшча, як вядома, не была ўдзельніцай перагавораў.

Ужо сам факт раптоўнай пастаноўкі на перагаворах такога сур’ёзнага пытання прымушае, як мінімум, ацаніць яго як непадрыхтаванае. А ў расійскай гістарыяграфіі была выказана абгрунтаваная думка аб патрабаванні СССР праходу савецкіх войск праз тэрыторыю Польшчы і Румыніі для супрацьдзеяння агрэсару як аб сродку зрыву перагавораў з Англіяй і Францыяй. Па шэрагу прычын з гэтым меркаваннем давядзецца згадзіцца. Па-першае, у Маскве, не горш чым у Парыжы і Лондане, ведалі, што для Польшчы, дзе яшчэ не забылі вайну 1920 г., была непрымальная прысутнасць на яе тэрыторыі савецкіх войск (зрэшты, як і нямецкіх). Сам Молатаў меў магчымасць канстатаваць гэта пасля размовы з польскім паслом В. Гжыбоўскім 11 мая, у якой пасол па даручэнні свайго ўрада выказаў афіцыйную трактоўку пазіцыі Польшчы адносна савецкай прапановы аб заключэнні англа-франка-савецкага дагавора аб узаемнай дапамозе, які б прадугледжваў не толькі германскую агрэсію супраць любога з трох удзельнікаў дагавора, але і агрэсію супраць усходнееўрапейскіх дзяржаў, уключаючы і Польшчу. Польская пазіцыя зводзілася да таго, што для Польшчы прымальныя пагадненні толькі на аснове ўзаемнасці, якой савецкі праект не прадугледжваў. Пасол, акрамя таго, адзначыў, што польскі ўрад не даручаў ураду саюзнай Францыі весці перамовы з савецкім урадам па пытаннях гарантавання Польшчы, паколькі такія пытанні могуць вырашацца толькі непасрэдна паміж Масквой і Варшавай [11, ł. 82]. Тое ж самае Ю. Бек у Варшаве патлумачыў намесніку наркама В. Пацёмкіну 10 мая. З атрыманай інфармацыі кіраўнік



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

савецкага ўрада зрабіў цалкам слушную выснову: “Польшча не хоча ў цяперашні момант звязваць сябе якім-небудзь пагадненнем з СССР або згодай на ўдзел СССР у гарантаванні Польшчы, але не выключае апошняга ў будучым” [8, т. 1, с. 449].

Здавалася б, што, маючы такое яснае разуменне пазіцыі Польшчы наконт ваенна-палітычнага супрацоўніцтва з СССР, савецкае кіраўніцтва будзе ўлічваць яе ў перагаворах з Англіяй і Францыяй ці паспрабуе змяніць яе на больш прыхільную, абапіраючыся на падтрымку сваіх партнёраў – саюзнікаў Польшчы. Гэтага, аднак, не адбылося. Наадварот, маючы некалькі месячаў часу, савецкі бок да пачатку перагавораў ваенных місій сфармуляваў безальтэрнатыўную платформу савецкай дэлегацыі, якая цалкам канфрантавала з пазіцыяй Польшчы. 4 жніўня ў дакуменце савецкага генеральнага штаба, у якім разглядаліся варыянты магчымых дзеянняў савецкіх узброеных сіл у выпадку агрэсіі Германіі супраць Англіі, Францыі, Польшчы або Румыніі было ўпершыню ад пачатку міжнароднага крызісу 1939 г.сфармулявана патрабаванне аб праходзе савецкіх войск праз тэрыторыю Польшчы і Румыніі. На аснове гэтага дакумента Сталін 7 жніўня зацвердзіў інструкцыю кіраўніку савецкай дэлегацыі для вядзення ваенных перагавораў, наркаму абароны К. Варашылаву [12, с. 386–387, 584]. Яна патрабавала ад савецкай дэлегацыі “перагаворы звесці да дыскусіі па асобных прынцыповых пытаннях, галоўным чынам аб пропуску нашых войск праз Віленскі калідор і Галіцыю, а таксама праз Румынію.”

“Калі высніцца, – гаварылася ў наступным пункце, – што *свабодны пропуск* нашых войск праз тэрыторыю Польшчы і Румыніі з’яўляецца выключаным (*курсіў наш – Р. Л.*), то заявіць, што без гэтай умовы пагадненне немагчымае…, што мы не лічым магчымым удзельнічаць у справе, загадзя асуджанай на правал” [12, с. 584]. Такім чынам, згода партнёраў на пропуск савецкіх войск праз тэрыторыю Польшчы і Румыніі разглядалася савецкім урадам як папярэдняя ўмова заключэння ім пагаднення, якая не падлягала абмеркаванню. Чаму ж гэта патрабаванне загадзя не было даведзена ўрадам Англіі і Францыі, а праз іх – і ўраду Польшчы? Напэўна, таму, што ў гэтым выпадку заходнія дзяржавы наўрад ці паслалі б у Маскву свае дэлегацыі, і Крэмль бы пазбавіўся эфектыўнага сродку націску на Берлін, ад якога спадзяваўся атрымаць болей, чым ад сваіх заходніх партнёраў. А пагадненне з Англіяй і Францыяй або з Германіяй былі альтэрнатывамі, якія ўзаемна выключаліся. Гэта, у прыватнасці, вынікала з паведамленняў паўпрэда Астахава. 8 жніўня ён пісаў аб той цане, якую Германія была гатовая заплаціць за пацвярджэнне незацікаўленасці СССР лёсам Данцыга

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

і Польшчы (тэрыторыяй на захад ад Віслы) і ўказваў пры гэтым, што "размовы такога кшталту (паміж СССР і Германіяй – Р. Л.) магчымыя толькі на базе адсутнасці англа-франка-савецкага ваенна-палітычнага пагаднення" [8, т. 2, с. 180]. І Сталін зрабіў свой выбар, рэалізаваны ў дагаворы аб ненападзенні з яго сакрэтным платаколам. Дагавор, як мінімум, аблегчыў Гітлеру завяршэнне падрыхтоўкі да разгрому Польшчы[1]. Матывы свайго выбару патлумачыў сам Сталін праз тыдзень пасля развязвання Германіяй вайны, аблягчаючы тым самым задачу сучаснага гісторыка. Ён зрабіў гэта, калі даваў указанні Г. Дзіміраву наконт неабходнасці змены курсу Камінтэрна з антыфашысцкага і антыгерманскага на прыхільны для Германіі. Вайна карысная для сіл сацыялізму, па-першае, тым, казаў ён, што дзве капіталістычныя групоўкі ў ходзе яе аслабляюць капіталістычную сістэму. "Мы можам манеўраваць, падштурхоўваючы адзін бок супраць другога, каб добра пабіліся". Па-другое, "у выніку разгрому Польшчы мы пашырым сацыялістычную сістэму на новыя тэрыторыі і насельніцтва" [13, с. 19]. Наступныя падзеі могуць служыць ілюстрацыяй гэтай заявы, хоць, натуральна, яны не цалкам супалі з жаданнямі крамлёўскіх стратэгаў.

Адзін з аўтараў савецка-германскага дагавора, В. М. Молатаў, назваў яго "паваротным пунктам у гісторыі Еўропы, ды і не толькі Еўропы" [14, с. 11]. Гэта сапраўды было так, бо цяпер Гітлер набыў упэўненасць, што будзе ваяваць толькі на адным фронце – заходнім, абапіраючыся пры гэтым на савецкую сыравіну. Але і савецкія кіраўнікі, нарэшце, атрымалі магчымасць выканаць ленінскі запавет і пашырыць сацыялізм на ўсходнія тэрыторыі Версальскай сістэмы.

У святле сталінскай заявы аб пашырэнні тэрыторыі сацыялізму, прагучаўшай ужо 7 верасня, відавочна, што так званую "пазіцыю чакання" развіцця падзей, занятую савецкім кіраўніцтвам у тыя дні, неабходна разглядаць толькі як выяву пэўнай тактыкі, звязанай з несупадзеннем мэтаў СССР і Германіі ў вайне. Гітлеру не ўдалося ізаляваць Польшчу, у вайну ўступалі Францыя і Англія, таму яму было пільна патрэбна як найхутчэй разграміць свайго польскага праціўніка. Ваеннае ўзаемадзеянне Германіі з СССР аблегчыла б рашэнне гэтай задачы. Яно таксама дало б магчымасць раздзяліць з савецкім партнёрам палітычную і маральную адказнасць за ўчыненую агрэсію. Таму Германія пачала ціснуць на СССР ужо з 4 верасня, каб схіліць яго як найхутчэй заняць тэрыторыю Польшчы, аднесеную да савецкай сферы інтарэсаў [15, с. 34–35]. А Сталін

[1]Вялікай з'яўляецца верагоднасць, што ён наогул не зрабіў бы яго, калі б ведаў, што давядзецца весці вайну на два франты. Аднак разгляд гэтага пытання на аснове аналізу існуючых крыніц выходзіць за межы артыкула.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

марудзіў, бо настроены быў на зацягванне вайны без удзелу СССР, каб праціўнікі “добра пабіліся” і стварылі для яго доўгачаканую магчымасць “кінуць вырашальную гіру на вагі”. Але ў гэтую свядомамарудлівую пазіцыю ўпісалася яго рашэнне задаволіць просьбу свайго германскага партнёра, каб часці вермахта ў ходзе аперацый супраць польскага войска пры неабходнасці заходзілі ў савецкую сферу інтарэсаў, вызначаную ў сакрэтным пратаколе [15, с. 35].

Гаворачы аб марудлівасці Сталіна на пачатку германскай агрэсіі супраць Польшчы, нельга не ўлічваць таксама і звычайную непадрыхтаванасць савецкай дзяржавы да такой маштабнай аперацыі, якая выявілася яшчэ да яе пачатку, у час мабілізацыі, ішоўшай з 7 верасня. Гаворка ідзе не толькі аб матэрыяльнай непадрыхтаванасці Чырвонай Арміі. Савецкаму кіраўніцтву даводзілася ўлічваць і псіхалагічную непадрыхтаванасць савецкага грамадства да ваенных дзеянняў, якія аб’ектыўна спрыялі фашысцкай Германіі, “галоўнаму падпальшчыку вайны”, як да таго часу яе кваліфікавала савецкая прапаганда. Неабходна было таксама даць час і насельніцтву Заходняй Беларусі, каб яно зарыентавалася ў намерах савецкага кіраўніцтва, што было няпроста пасля пяцігадовага маўчання Масквы наконт лёсу беларусаў у Польшчы і пасля разгрому па ініцыятыве Сталіна незадоўга да вайны Камуністычнай партыі Польшчы.

Рашэнне аб уводзе войск было прынята, перш за ўсё, з улікам гэтых фактараў не пазней 9 верасня. Акрамя прыведзенай вышэй спасылкі на дырэктывы Сталіна Камінтэрну, яшчэ адным, і досыць пераканаўчым аргументам на карысць гэтага сцверджання з’яўляецца варыянт дырэктывы наркама абароны К. Варашылава і начальніка генштаба РККА Б. Шапашнікава Ваеннаму савету БВА ад гэтай даты. Яна прадугледжвала ўвод савецкіх войск у Польшчу ўжо ў ноч з 12 на 13 верасня [16, с. 71–72].

З прыняццем гэтага рашэння давялося паспяшацца пасля атрымання 8 верасня паведамлення аб заняцці нямецкімі войскамі Варшавы – інфармацыі, якая пазней не спраўдзілася. 14 верасня дырэктыва была выпраўлена і “вызваленчы паход” пачаўся 17 верасня – тады, калі болей адцягваць яго было нельга, не рызыкуючы стварыць сітуацыю, у якой давялося б прымаць Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну з рук Германіі. У выніку гэтага паходу беларускі і ўкраінскі народы былі аб’яднаныя – як ні прыкра гэта прызнаць, аб’яднаныя ў выніку змовы двух дыктатараў, Гітлера і Сталіна, менш за ўсё думаўшых аб інтарэсах народаў, якіх аб’ядноўвалі. Але Гісторыя на гэтым не спынілася, Яе Вялікасць пазней праявіць сваю здольнасць іранізаваць

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

над сваімі занадта самаўпэўненымі суб’ектамі, як гэта ёй даводзілася рабіць неаднойчы.

Як бачым, савецкія кіраўнікі дачакаліся сітуацыі, калі “ворагі сацыялізму” (якія атаясамліваліся з ворагамі СССР) пачалі біцца паміж сабой, а СССР атрымаў магчымасць заняцца вяртаннем тэрыторый, належаўшых Расійскай імперыі да Першай сусветнай вайны. Следам за далучэннем да СССР Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны наступіла чарга рэспублік Прыбалтыкі, Фінляндыі, затым Бесарабіі і Паўночнай Букавіны. На некаторы час у кіруючых вярхах савецкай дзяржавы запанавала эйфарыя ад дасягнутых поспехаў. Аднак цягнулася яна нядоўга. Атрымаўшы вольныя рукі для дзеянняў на Захадзе, гітлераўская Германія следам за Польшчай на працягу некалькіх тыдняў разграміла і яе саюзніцу Францыю. Імклівы разгром Францыі адкрыў, нарэшце, вочы маскоўскім стратэгам на тую вялізную небяспеку, якая насоўвалася на савецкую краіну. “Поди ж ты, знай, что Франция развалится за две недели”, – засмучаўся ўжо пасля вайны адзін з тых трыумфатараў 1939 года, сталінскі наркам Варашылаў [17]. За ўпартую прыхільнасць дзяржаўнага кіраўніцтва догме 1920 г. народам Савецкага Саюза давялося заплаціць трагічную цану.

## Крыніцы і літаратура


1. Ленин, В. И. Неизвестные документы. 1891–1922 гг. / В. И. Ленин. – М. : «Российская политическая энциклопедия (РОССПЭН)», 2000. – 607 с.

2. Ленин, В. И. Полн. собр. соч. : в 55 т. / В. И. Ленин. – М. : Издат. полит. литерат., 1981. – Т. 42.

3. Сталин и Каганович. Переписка. 1931–1936 гг. – М. : РОССПЭН, 2001. – 748 с.

4. Сталин, И. В. Речь на пленуме ЦК РКП(б) 19 января 1925 г. / И. В. Сталин // Сочинения : 18 т. – М.: Госполитиздат, 1947. – Т. 7. – С. 11–14.

5. Документы внешней политики СССР : в 22 т. – М. : Политиздат, 1970. – Т. 16. – 920 с.

6. Известия. – 1938. – 29 сентября.

7. Сидоров, А. Ю. История международных отношений. 1918–1939 гг. / А. Ю. Сидоров, Н. Е. Клеймёнова. – М. : Центрполиграф, 2006. – 640 с.

8. Год кризиса, 1938–1939 : Документы и материалы : в 2 т. – М.: Политиздат, 1990. – Т. 1: 29 сент. 1938 г. – 31 мая 1939 г. – 554 с.; Т. 2: 2 июня 1939 г. – 4 сент. 1939 г. – 986 с.

9. Документы и материалы кануна второй мировой войны. 1937–1939 : в 2 т. – М. : Политиздат, 1981. – Т. 2: Январь – август 1939 г. – 415 с.




РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

10. История России. XX век: учеб. пособие / О. А. Яновский [и др.]. – Мн. : РИВШ, 2005. – 702 с.

11. Archiwum Akt Nowych (Warszawa). – MSZ. Wydział Wschodni. – Sygn. 6652A.

12. Документы внешней политики СССР : в 24 т. – М. : Междунар. отношения, 1992. – Т. 22. – Кн. 1. – 712 с.

13. Фирсов, Ф. И. Архивы Коминтерна и внешняя политика СССР в 1939–1941 гг. / Ф. И. Фирсов // Новая и новейшая история. – 1992. – № 6. – С. 12–35.

14. Молотов, В. М. О ратификации советско-германского договора о ненападении / В. М. Молотов // Большевик. – 1939. – № 15–16. – С. 7–13.

15. Случ, С. З. Советско-германские отношения в ходе польской кампании и вопрос о вступлении СССР во вторую мировую войну / С. З. Случ // Славяноведение. – 1999 – № 6. – С. 32–43.

16. Лебедева, Н. С. Польша между Германией и СССР в 1939 году / Н. С. Лебедева // Война и политика. 1939–1941 / Отв. ред. А. О. Чубарьян. – М. : «Наука», 1999. – С. 65–84.

17. У порога войны: беседа с д. и. н. В. М. Кулишем / Комсомольская правда. – 1988. – 24 августа.

УДК 930(476.2)«20»:94(47+57):94(430)«1939-1941»

**С. Н. Рожкова**

*ГГУ имени Ф. Скорины, г. Гомель*

# ПЛАНЫ СССР И ГЕРМАНИИ НАКАНУНЕ И В НАЧАЛЬНЫЙ ПЕРИОД ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ В ПОСТСОВЕТСКОЙ БЕЛОРУССКОЙ ИСТОРИОГРАФИИ

*В статье охарактеризована современная белорусская историография, раскрывающая советские и германские военно-политические планы накануне и в начальный период Великой Отечественной войны. Автор установил важнейшие положения и выводы, сделанные белорусскими историками постсоветского периода по данной проблематике, определил их научную обоснованность.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ